Падтрымай "Вясну" на PATREON

Любоў Санкевіч пакаралі штрафам 26 базавых велічынь

13.07.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Актывістку з Бабруйска **Любоў Санкевіч** пакаралі быццам за ўдзел у акцыі салідарнасці з палітзняволенымі, што прайшла 22-га чэрвеня ў Менску, а фактычна за інтэрв'ю незалежным СМІ.

Па інфармацыі Беларускага Радыё Рацыя, у часе судовага паседжання быў прадэманстраваны відэа-стрым Радыё Свабода, на якім бачна, што жанчына не трымае ў руках плакатаў, адказвае на пытанні журналістаў і стаіць у баку ад мітыноўцаў. Аднак бабруйскі суд не ўлічыў гэтыя доказы і пакараў пенсіянерку штрафам 26 базавых велічынь, што на сёння складае амаль паўтысячы беларускіх рублёў.


Кажа Любоў Санкевіч:


> *– 22-га мяне хапаюць на чыгуначным вакзале. Злачынцу знайшлі! Я пенсіянерка-тэрарыстка, кагосьці забіла, абрабавала? Што я здзейсніла? Сказала праўду. А праўда не падабаецца. Я перастала верыць у судовую беларускую ўладу. Таму што ў нас няма судоў. У нас ёсць судзілішчы. Калі б у нас былі суды, то суддзі разбіраліся б па закону, а не па званку аднекуль. Я маўчаць не буду. Чым больш яны душыць мяне будуць, тым больш я буду гаварыць.*


Актывістка адзначыла, што збіраецца абскарджваць рашэнне суда, а таксама распачаць галадоўку ў Адміністрацыі Прэзідэнта, пратэстуючы супраць несправядлівага выраку.

Твитнуть










"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітзняволеных знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY